УДК 678.6:619(476.6)

# ПАДРЫХТОЎКА ВЕТЭРЫНАРНЫХ КАДРАЎ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIX СТ.: ДА ПАСТАНОЎКІ ПРАБЛЕМЫ

**Радзюк А.Р., Галубовіч В.У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У 50-60-я гг. XIX ст. на Гродзеншчыне даволі востра стаяла праблема забеспячэння ветэрынарнымі кадрамі. Сваю ролю тут адыграла закрыццё па палітычных прычынах Віленскай Медыка-Хірургічнай акадэміі, якая да 1842 г. з'яўлялася асноўным пастаўшчыком спецыялістаў у гэтай галіне ў межах усёй Беларусі і Літвы. Не здолеў вырашыць гэтай праблемы і створаны ў 1848 г. Горы-Горацкі земляробчы інстытут, які, між іншым, ажыццяўляў падрыхтоўку канавалаў. Па-першае, у ім навучаліся ў асноўным студэнты з усходняй часткі беларускіх зямель, а па-другое, ён быў фактычна ліквідаваны ў 1863 г. з прычыны ўдзелу навучэнцаў у нацыянальна-вызваленчым паўстанні. Не магла забяспечыць неабходнай колькасцю кадраў і адкрытая ў 1841 г. у Вільні ветэрынарная вучэльня. Недахоп ветэрынарных служачых у вызначаны перыяд адчуваўся, у першую чаргу, у сярэднім і ніжэйшым звяне. Неспрыяльная эпізаатычная сітуацыя, даволі частыя выпадкі пошасці падштурхнулі мясцовыя гарадзенскія ўлады да прыняцця захадаў па вырашэнню гэтай праблемы ўласнымі сіламі.

Падрыхтоўка спецыялістаў ветэрынарнага профілю ў сярэдзіне XIX ст. значна адрознівалася ад цяперашняй схемы прафесійнай адукацыі. Вывучэнне матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва ў Гродне дазволіла выявіць некалькі шляхоў атрымання ветэрынарных ведаў на Гродзеншчыне ў вызначаны час.

Па-першае, у 1850 г. з прычыны цяжкасцяў, якія сустракаліся ў той час у барацьбе з пошасцю жывёл, Гарадзенская медычная ўправа ініцыявала набор хлопцаў для навучання пад наглядам гарадзенскага старэйшага ветурача і іншых ветэрынараў, якія выказалі на тое згоду. Асноўнай мэтай навучання абвяшчалася падрыхтоўка “ветэрынарных вучняў, якія маглі б да прыбыцця лекара аказаць першую дапамогу хворай жывёле ды, увогуле, садзейнічаць спыненню пошасці” [1, а. 4]. Што цікава, набор для патэнцыяльных прэтэндэнтаў на навучанне быў абвешчаны толькі ў буйных прыватнаўласніцкіх маёнтках. Рабілася гэта па дзвюм прычынам. Па-першае, з-за хранічнага недахопу грошай у мясцовым бюджэце ўладары такіх зямельных валоданняў павінны



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

былі самі выдаткоўваць грошы на ўтрыманне такіх хлопцаў падчас іх вучобы. Па-другое, менавіта ў буйных гаспадарках была найбольшая канцэнтрацыя свойскай жывёлы, што рабіла іх найбольш небяспечнымі ў эпізаатычным плане. Натуральна, што па завяршэнню курса навук такія спецыялісты павінны былі вярнуцца да свайго пана. Што тычыцца патрабаванняў да "абітурыентаў", то яны былі мінімальныя і абмяжоўваліся ўменнем чытаць і пісаць. Вядома, што ў ліпені 1851 г. па гэтай праграме ў ветурачоў Макоўскага і Кяркоўскага навучалася пяць хлопцаў [1, а. 7].

Падобны спосаб падрыхтоўкі ветспецыялістаў у Гродзенскай губерні існаваў, як мінімум, да сярэдзіны 60-х гг. XIX ст. Але за гэты час ён зведаў пэўныя змены. Зразумела, што пасля адмены прыгону ў 1861 г. (а можа, і яшчэ раней) змяніліся правілы адбору хлопцаў для набыцця ведаў пры ветэрынарных урачах. Навучанне адбывалася цягам трох гадоў. Падчас выпускнога іспыта пытанні тычыліся выключна вузкай прафесійнай спецыялізацыі: спосабаў пушчання крыві рознага кшталту жывёлам, прышчаплення воспы і г.д. Адметна, што ў выніку паспяховага заканчэння курса ў 60-я гады выпускнік атрымліваў званне "Майстр цырульніцкага цэху па ветэрынарнаму мастацтву" і яму выдавалася пасведчанне на вольную практыку [2, а. 281].

Па-другое, пэўную ролю ў падрыхтоўцы ветэрынарных кадраў адыграла існаваўшая ў 60-70-я гады ў Гародні фельчарска-ветэрынарная школа. Ініцыятарам яе стварэння выступіў губернскі ўрач гарадзенскай палаты Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў Глеб Лебядзеў. У сваіх лістах-прашэннях ён абгрунтоўваў неабходнасць стварэння падобнай навучальнай установы, у першую чаргу, недахопам сярэдніх і ніжэйшых лекарскіх кадраў у сельскай мясцовасці. Разам з тым гэты чыноўнік медычнага дэпартамента звярнуў увагу і на незадавальняючы стан ветэрынарнай дапамогі па губерні ў цэлым. Вось чаму ў канчатковым сваім праекце ён выступіў з прапановай адкрыцця ў Гародні школы, дзе б навучэнцы, акрамя сваёй асноўнай спецыяльнасці фельчара, атрымлівалі б яшчэ і дадатковую – ветэрынара [2, а. 5].

Адкрыццё новай навучальнай установы ва ўсе часы было справай досыць складанай. Не з'яўляецца выключэннем з гэтага правіла і дадзены канкрэтны выпадак. Пачнем з таго, што ў праекта Г. Лебедзева знайшліся праціўнікі, якія лічылі паралельнае навучанне будучых фельчараў "канавальнаму мастацтву" справай "нязручнай". Як заўсёды ў падобных выпадках, востра стаяла праблема сродкаў, неабходных для ўтрымання дадзенай катэгорыі навучэнцаў, забеспячэння іх інтэрнатам, памяшканнем для навучання і г.д. Тым не менш, на



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

працягу года і шасці месяцаў усе арганізацыйныя цяжкасці былі пераадолены.

Сама школа пачала сваю дзейнаць у студзені 1864 г. Дарэчы, у дакументах таго часу яна праходзіць выключна як "фельчарская". Разам з тым, паколькі там вялася падрыхтоўка і іншых спецыялістаў, сёння мы маем поўнае права называць школу "фельчарска-ветэрынарнай". Колькасць навучэнцаў у ёй была невялікай – 15 хлопцаў. Зноў жа пры іх наборы выкарыстоўваўся саслоўны прынцып – абітурыенты павінны былі належаць да класа казённых (дзяржаўных) сялян. Зразумела, што пасля заканчэння курса навук яны мусілі вярнуцца да сябе на радзіму. Таксама ў дачыненні да іх выкарыстоўваўся і адукацыйны цэнз. Падчас прыёму жадаючыя паступіць у азначаную школу павінны былі прад'яўляць пасведчанне аб добрым заканчэнні сельскай прыходскай вучэльні. Акрамя бацькоўскага дазволу, патэнцыяльныя навучэнцы таксама мусілі атрымаць згоду на свой ад'езд усёй сялянскай грамады, да якой яны належалі. Дзеля гэтага на месцы пражывання таго ці іншага хлопца збіраўся адмысловы сход "пяціхатных выбарных", які прымаў "прыгавор" з дазволам на паступленне ў "фельчарскія вучні". Сярэдні ўзрост "першакласнікаў" складаў 17–19 год. На іх утрыманне казна выдаткоўвала 60 руб. на год [2, а. 64].

Тэрмін навучання ў фельчарска-ветэрынарнай школе быў акрэслены чатырма гадамі. Але, верагодна, ён мог вар'іравацца. Усё залежыла ад ступені падрыхтаванасці таго ці іншага выпускніка. Акрамя спецыялізаваных, у школе выкладаліся і агульнаадукацыйныя дысцыпліны. У ліку прадметаў, што здавалі выпускнікі, былі арыфметыка, рускае і лацінскае чытанне і чыстапісанне, закон Божы і свяшчэнная гісторыя [4, а. 3-5]. Верагодней за ўсё, навучанне было арганізавана па праграме і прынцыпах, што былі выкладзены ў "Палажэнні аб фельчарскіх школах пры ваенных шпіталях", выдадзеным у 1838 г. Ім прадугледжваўся шасцідзённы вучэбны працэс, пры якім субота адводзілася для паўтарэння ўсяго матэрыялу, што быў пройдзены цягам тыдня [5, а. 6]. Асаблівасць гарадзенскай навучальнай установы заключалася ў тым, што тут яшчэ выкладалася і ветэрынарная справа, і таму тэрмін навучання складаў не тры, а чатыры гады.

У тыя часы значная ўвага надавалася атрыманню практычных навыкаў у працэсе навучання. Фельчарскую практыку навучэнцы праходзілі пры гарадзенскай акруговай лячэбніцы, даглядаючы за хворымі і дапамагаючы лекарам. Ветэрынарныя практычныя веды яны



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

набывалі праз “хаджэнне за хворай скацінай” і анатаміраванне здохлых жывёл [4, а. 68].

Выпускны іспыт у гарадзенскай фельчарска-ветэрынарнай школе складаўся з трох этапаў. Першы ўключаў пытанні па агульнаадукацыйным дысцыплінам, пасля надыходзіла чарга праверкі ведаў у фельчарскім рамястве. І нарэшце, у прысутнасці камісіі экзаменаваны адказваў на пытанні па ветэрынарыі. Гэты іспыт уключаў у сябе заданні па сямі накірунках: 1) анатомія жывёл; 2) хірургія; 3) зубы жывёл; 4) падкоўванне; 5) дыетэтыка; 6) фармакалогія; 7) паталогія і тэрапія. Некаторыя з тагачасных пытанняў-адказаў могуць выклікаць усмешку ў сучасных спецыялістаў-ветэрынараў (напрыклад, такія з іх, як: “Аб хітрыках, што робяць несумленныя гандляры падчас продажу коней” ці “Аб ужыванні і прыгатаванні бульбы”), але былі і такія, што не губляюць сваёй актуальнасці на працягу стагоддзяў.

Пры ўмове паспяховай здачы іспытаў і наяўнасці сведчанняў аб набыцці адпаведных практычных навыкаў у фельчарскай ды ветэрынарнай справах выпускнікам выдавалася пасведчанне аб зацверджанні іх у званні “фельчара і ветэрынарнага вучня”. Зразумела, што прыцягальнай для большасці асоб, якія заканчвалі азначаную школу, была лекарская спецыялізацыя. Але ўжо ў тыя часы існавала сістэма размеркавання, якая не пакідала маладым людзям шансаў на выбар месца працы, нават прафесіі. Аб гэтым сведчыць ліст Я. Алфёрава, у якім ён адзначаў, што ў 1869 г. падаў прашэнне аб прызначэнні сельскім медычным фельчарам, але “замест гэтага быў прызначаны ветэрынарным фельчарам Ваўкавыскага павету і займаў гэтую пасаду да 1875 г.” [6, а. 59].

На жаль, недахоп крыніц не дазваляе цалкам раскрыць тэму падрыхтоўкі ветэрынарных кадраў на Гарадзеншчыне ў вызначаны перыяд. Прыведзеныя ў артыкуле факты толькі ўздымаюць праблему, не даючы адказу на многія пытанні. У сувязі з абмежаванасцю базы крыніц, нам не ўдалося выявіць іншых дат існавання фельчарска-ветэрынарнай школы. Невядома, колькі было падрыхтавана выпускнікоў з двайной спецыялізацыяй. Выяўленыя намі факты сведчаць, што ў 1868 г. і пачатку 70-х гадоў XIX ст. выпускнікі гэтай навучальнай установы здавалі экзамен на атрыманне фельчарскай кваліфікацыі [7, а. 1; 3, а. 24]. Ці азначала гэта, што школа перайшла да выключна медычнага профілю? Ці былі іншыя спосабы падрыхтоўкі ветэрынарных спецыялістаў у той час? Гэта няпоўны пералік тых пытанняў, на якія чакаюць адказы.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

**СПАСЫЛКІ**
1. Нацыянальны гістарычны архріў Беларусі ў Гродне. Ф. 1, воп. 29, спр. 318.
2. НГАБ у Гродне. Ф. 31, воп. 3, спр. 377.
3. НГАБ у Гродне. Ф. 9, воп. 3, спр. 116.
4. НГАБ у Гродне. Ф. 9, воп. 1, спр. 90.
5. НГАБ у Гродне. Ф. 2, воп. 3, спр. 860.
6. НГАБ у Гродне. Ф. 9, воп. 3, спр. 57.
7. НГАБ у Гродне. Ф. 9, воп. 3, спр. 46.

УДК 502.131.1.

# СИСТЕМА ИНДИКАТОРОВ УСТОЙЧИВОГО РАЗВИТИЯ

**Смаль А.Д.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Необходимость разработать индикаторы устойчивого развития была отмечена в «Повестке дня на 21 век», принятой на Конференции ООН по окружающей среде и развитию в Рио-де-Жанейро в 1992 г. В 40-й главе данного документа было отмечено: «В целях создания надежной основы для процесса принятия решений на всех уровнях и содействия облегчению саморегулируемой устойчивости комплексных экологических систем и систем развития необходимо разработать показатели устойчивого развития» [1].

Контроль за достижением целей устойчивого развития, управление этим процессом, оценка эффективности используемых средств и уровня достижения поставленных целей требуют разработки соответствующих критериев и показателей – индикаторов устойчивого развития.

Невзирая на то, что разработка индикаторов устойчивого развития еще не завершена, на сегодня уже предложены проекты индикаторов для систем разных масштабов: глобального, регионального, национального, локального, отраслевого и даже для отдельных населенных пунктов и предприятий.

Мировой опыт в области разработки индикаторов показывает, что существует два подхода к их построению:

1. Построение системы индикаторов, каждый из которых отражает отдельные аспекты устойчивого развития. Чаще всего в рамках общей системы выделяются следующие подсистемы показателей:

- ✓ экологические;
- ✓ экономические;
- ✓ социальные;
- ✓ институциональные.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ